Отдел образования, спорта и туризма
Быховского райисполкома

Государственное учреждение образования
«Ясли-сад №2 «Журавинка» г. Быхова»

# Исследовательский проект
# *«Фальклорнае свята «Гуканне вясны»*

**в рамках реализации инновационного проекта**
***«Внедрение модели формирования гражданской идентичности обучающихся в рамках организации и деятельности региональных виртуальных музеев»***



Аддзел адукацыі, спорта и турызма
Быхаўскага райвыканкама

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Яслі-сад №2 «Журавінка» г. Быхава»

**ДАСЛЕДЧЫ ПРАЕКТ**

# «ФАЛЬКЛОРНАЕ СВЯТА «ГУКАННЕ ВЯСНЫ»

С.М. Купцова,
выхавацель дашкольнай адукацыі

ЗМЕСТ


| | |
|---|---|
| Уводзіны | 3 |
| Рэалізацыя  даследчага праекта | 4 |
| Заключэнне | 7 |
| Літаратура | 8 |
| Дадатак | |

## Уводзіны

Праблема патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення – адна з самых актуальных у нашай рэспубліцы. Няма ні воднай нацыі на зямлі, якая б не зберагала сваю мову, сваю культуру. Кожны адукаваны чалавек павінен ведаць традыцыі свайго народа. Ступень культурнасці народаў можна вызначыць адносна таго, наколькі актыўна яны супрацьстаяць працэсу знікнення каштоўных народных традыцый, наколькі накіравана яны шукаюць спосабы захавання і адраджэння страчаных скарбаў.

Роля дзіцячага сада незамяніма з пункту гледжання выхавання не толькі індывіда, але і нацыі ўвогуле. Дзіцяці ніколі не забудзе тое, што яму заклалі ў першыя гады жыцця. Больш таго, яно з вялікай цікавасцю ўсведамляе ўсё новае, незвычайнае, тое, што ўзбагачае яго ўражанні.

Беларускія фальклорныя святы, якія адбываюцца ў дзіцячым садзе, не толькі вельмі цікавыя і вясёлыя забавы для малят, але яны маюць вялікі выхаваўчы, развіваючы і адукацыйны патанцыял. Перш за ўсё, гэта вельмі спрыяльны сродак выхавання пачуцця патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці, якія адыходзяць каранямі да гісторыі і культуры свайго народа.

Народная музыка, якая выкарыстовываецца пры іх правядзенні, выклікае цікавасць ў дзяцей, прыносіць ім радасць, стварае добры настрой, а таксама валодае вялікай мастацкай годнасцю і мае высокі пазнавальны кошт. Багацце і разнастайнасць зместу дзіцячага фальклору: прыказак, прымавак, загадак, забаўлялак, заклічак – дазваляе выбраць найбольш яркія яго ўзоры. Сродкамі народнага фальклора дзеці знаёмяцца з жыццём і бытам беларускага народа. Усе гэтыя мастацкія сродкі выклікаюць цікавасць да творчасці Беларусі, жаданне працягваць знаёмства з ім.

Даследчы праект «Фальклорнае свята «Гуканне вясны» разлічаны на сярэднюю працягласць рэалізацыі: на працягу некалькіх тыдняў, пакуль ідзе падрыхтоўка да свята.

Мэтай яго здзяйснення з’явілась жаданне:

- дапамагчы выхаванцам больш падрабязна пазнаёміцца з набліжаючымся веснавым святам;
- сабраць і данесці да выхаванцаў цікавую і зразумелую інфармацыю аб ім;
- спрыяць адлюстраванню дзецьмі сваіх уражанняў у мастацкай дзейнасці;

– падрыхтаваць альбом з малюнкамі, фатаграфіямі, тэарэтычным матэрыялам па тэме.

А ў якасці выніку работы над праектам арганізаваць правядзенне фальклорнага свята.

Такім чынам, распачынаючы работу над праектам, мы паставілі перад сабой мэту дакладна пазнаёміць дзяцей з беларускім фальклорным святам «Гуканне вясны».

Згодна з ёй вызначылі задачы:

- садзейнічаць выхаванню пачуцця патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці дзяцей дашкольнага ўзроста;
- пазнаёміць дзяцей з гісторыяй ўзнікнення свята, яго вытокаў;
- даць звесткі аб традыцыях яго святкавання;
- пазнаёміць з багаццем беларускага дзіцячага фальклора, які выкарыстоўваецца падчас яго святкавання;
- спрыяць фарміраванню цікавасці дзяцей да розных відаў беларускай народнай творчасці (музычнай, мастацкай, моўнай, гульнёвай).

## Рэалізацыя даследчага праекта

Работа над рэалізацыяй праекта праходзіла праз чатыры этапы:

1 этап – вызначэнне актуальнай і пасільнай мэты і задач будучай дзейнасці на пэўны адрэзак часу.

2 этап – разработка плана дзейнасці па дасягненню мэты праекта:

- вызначыць, што дзецям ужо вядома;
- аб чым дзеці хочуць даведацца;
- знайсці неабходныя звесткі і наглядны матэрыял.

3 этап – рэалізацыя праекта: арганізацыя практычнай дзейнасці па падрыхтоўкі да свята, яго правядзенне.

4 этап – заключны: абагульненне, аналіз вынікаў дзейнасці, падрыхтоўка альбома з тэарэтычным і практычным матэрыялам.

Пасля таго, як на першым этапе былі вызначаны мэта і задачы праектнай дзейнасці, мы перайшлі да наступнага этапа – састаўлення плана дзейнасці па яго рэалізацыі.

Спачатку правялі размову з дзецьмі, каб вызначыць, што яны ўжо ведаюць пра свята «Гуканне вясны»?

- Гэта свята беларускае, бо яго назва гучыць на беларускай мове (Паліна С.).
- Яно святкуецца вясной (Ваня Ф.).
- На ім гукаюць вясну, таму яно так і называецца (Соня П.).
- У час яго правядзення пяюць песці і танцуюць, бо гэта ж свята!(Дарына К.)
- Людзі на ім, напэўна, апранаюцца ў беларускія касцюмы, бо гэта беларускае свята (Ігар М.).

У час размовы з дзецьмі аб тым, што б яны хацелі даведацца пра гэтае свята, атрымалі наступныя пытанні:

- Ці даўно святкуецца гэта свята? (Соня П.)
- Як яго пачалі святкаваць, дзеля чаго? (Андрэй Г.)
- Якія рэчы патрэбны для яго святкавання? (Максім Б.)
- Ці можам мы іх зрабіць сваімі рукамі? (Ігар М.)
- Што робяць людзі ў час святкаваня? (Ваня Ф.)
- Якія песні спяваюць, якія танцы танцуюць у час свята? (Улляна М.)
- Які вершы, прыказкі і прымаўкі, гульні выкарыстоўваецца? (Мілана П.)

Для таго каб адказаць на гэтыя і іншыя пытанні, мы саставілі план праекта (Дадатак 1). Згода з ім, на этапе практычнай рэалізацыі праекта арганізавалі і правялі шмат разнастайных відаў дзейнасці з дзецьмі.

Шукаючы матэрыял для правядзення размоў з дзецьмі, мы звярнуліcь да разнастайных літаратурных крыніц, дзе знайшлі дакладныя звесткі, якія даюць адказы на многія пытанні, якія зацікавілі дзяцей (Дадатак 2). Таксама запрашалі ў госці бабулю адной з нашых выхаванак, каб яна расказала пра сімвал свята – жаваранка. У кнігах знайшлі і разнастайны беларускі дзіцячы фальклор, які чыталі і вучылі разам з дзецьмі (Дадатак 3).

Вялікую ўвагу мы звярталі менавіта на падбор фальклорнага матэрыяла, які павінен мець шэраг асаблівасцей:

- быць зразумелым для ўспрымання дзяцьмі па сэнсаваму зместу;
- быць даступным для ўзнаўлення дзецьмі;
- мець дыманічнасць дзеянняў;
- адпавядаць тэматыке свята.

Музычны кіраўнік дапамагла падабраць і вывучыць беларускія песні і танцы. Таксама ёй быў арганізаваны дзіцячы акестр: з дапамогай музычных

інструментаў дзеці выконвалі беларускія музычныя творы ў суправаджэнні з фанаграмай.

У вольны час мы разам з дзецьмі гулялі ў разнастайныя беларускія рухомыя гульні, якія датычацца вясенняй тэматыкі (Дадатак 4).

З цікавасцю разглядалі разам з дзецьмі малюнкі, на якіх былі адлюстраваны святочныя гулянні. Яны дапамаглі нам дакладна даведацца, якім чынам праходзіла свята, у якое святочнае аддзенне апраналіся нашы продкі. Мы ўбачылі, якімі разнастайнымі могуць быць тыя жаваранкі, пра якіх мы размаўлялі.

Дзеці з вялікай ахвотай і цікавасцю рабілі сваімі рукамі жаваранкаў з пластыліну, а з дапамогай канструявання з паперы выраблялі святочныя вяночкі з картону і рознакаляровай патеры, праяўляючы творчасць, старанне і акуратнасць.

Вынікам рэалізацыі праекта стала правядзенне беларускага фальклорнага свята «Гуканне вясны». У яго сцэнарый ўвайшоў менавіта той тэарэтычны і практычны матэрыял, які быў вывучаны і падрыхтаваны з дзецьмі ў час папярэдняй работы (Дадатак 5).

Заключным этапам работы стала падрыхтоўка альбома з малюнкамі, фатаграфіямі, падабраным матэрыялам па тэме даследавання, які можа быць выкарыстованы і іншымі педагогамі.

Работа па рэалізацыі праекта працягвалась два тыдні, пакуль ішла падрыхтоўка да свята. Усе формы работы з дзецьмі, якія былі арганізаваны ў час рэалізацыі праекта, не выклікалі цяжкасцей і не стваралі перашкод для арганізацыі і правядзення планавай працы з дзецьмі ў рамках адукацыйнага працэсу.

## Заключэнне

Рэалізацыя даследчага праекта дапамагла дзецям перайсці ад агульнага ўспрымання свята як элемента нацыянальнай культуры да ўсвядомленага разумення святочнай ідэі і актыўнаму творчаму ўдзелу ў святочнай дзейнасці.

Дасягнуць гэтага ўдалось праз выкарыстанне эмацыянальна-дзейнаснага кампанента: наяўнасць пазнавальнай цікавасці да вытокаў свята, жаданне атрымаць аб ім новыя звесткі, актыўны творчы ўдзел дзяцей у падрыхтоўцы і правядзенні свята.

Вынікі праведзенай работы дазваляюць нам сцвярджаць, што абраная тэма даследавання:

- зразумелая і цікавая для дзяцей;
- мае пэўныя часовыя рамкі;
- мае пэўную практычную значнасть і дакладны вынік;
- спрыяе фарміраванню ў дзяцей разнастайных мастацкіх уменняў;
- можа быць выкарыставаны іншымі педагогамі ў сваёй практыкі;
- спрыяе фарміраванню патрыятычных пачуццяў і нацыянальнай самасвядомасці дзяцей.

**Літаратура**


1. Аберган, В. П. Народная спадчына – дашкольнікам: дап. для педагогаў здіцячых дашкольных установ / В. П. Аберган, А. К. Лявонава, Т. У. Арлова. – Мінск : НМ Цэнтр, 1998. – 152 с. : мал.
2. Аляхновіч, А. М. Беларускі дзіцячы фальклор / А. М. Аляхновіч, А. С. Фядосік. – Мінск : "Беларусь", 1994. – 272 с.
3. Васілевіч, У. А. Беларускі народны каляндар / У. А. Васілевіч. – Мінск : Ураджай, 1993.- 80 с. : мал.
4. Коваль, У. І. Беларускія народныя святы і звычаі / У. І. Коваль, В. С. Новак. – Гомель : "Юнацтва", 1993. – 137 с.
5. Красюк, В. С. Праменьчыкі выхавання патрыятызму : дап. для педагогаў ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі : у 2 ч. Ч. 1 / В. С. Красюк, М. М. Сцепчанка, К. В. Шавяленка. – Мазыр : ТАА ВД "Белы Вецер", 2009. – 154 с.
6. Лозка, А. Ю. Веснавыя святы / А. Ю. Лозка. – Мінск : Народная асвета, 1992. – 367 с.
7. Пралыгіна, Н. В. Далучэнне дашкольнікаў да беларускай нацыянальнай культуры сродкамі народных гульняў / Н. В. Пралыгіна ; пад агульнай рэдакцыяй М. У. Чачэты. – Мазыр : ТАА ВД "Белы Вецер", 2006. – 76 с.

Дадатак 1

## План рэалізацыі праекта

| Зносіны | Гульнёвая дзейнасць | Музычная дзейнасць | Мастацкая дзейнасць | Мастацка-моўная дзейнасць |
|---|---|---|---|---|
| 1. Размова "Адкуль пайшло свята "Гуканне вясны"?<br>2. Размова "Жаваронкі-птушачкі"<br>3. Размова "Святочны касцюм" | Беларускія народныя гульні "Шпакі", "Промень сонейка" | 1. Завучванне беларускіх песень: "Веснавое сонейка", "Жаваранкі", "Прыходзь, вясна"<br>2. Развучванне беларускіх танцаў: "Полька беларуская", "Вясняначка".<br>3. Гульня на музычных інструментах. | 1. Лепка "Жаваранкі"<br>2. Аплікацыя "Веснавыя вяночкі"<br>3.Канструяван-не з паперы "Прыгожыя птушачкі" | 1. Чытанне і завучванне беларускіх народных прыказак і прымавак, лічылак, вершаў, заклічак, звязаных з вясенняй тэматыкай.<br>2. Разгляданне малюнкаў з адлюстраван-нем святочных гулянняў. |

Дадатак 2

## Інфармацыйны матэрыял

### *Фальклорнае свята «Гуканне вясны»*

Кожнай пары года адпавядалі пэўныя абрады, звычаі, рэтуалы, песні, прыкметы і павер'і.

Вясной пачыналіся самыя адказныя сялянскія справы: ворыва, сяўба, выган скаціны ў поле. Ад таго, як хутка і своечасова будзе выконвацца гэтая праца, залежыў будучы дабрабыт сям'і. Беларуская прыказка наступным чынам тлумачыць гэтую прыродную залежнасць: "Восень кажа – я раджу, вясна кажа – пачакай, як дагаджу". Важныя вехі ў працоўнай дзейнасці селяніна мелі адпаведныя звычаі і абрады.

Абуджэнне прыроды пасля працяглай зімовай спячкі патрабавалі аднаўлення чалавека. А пад нагамі па-ранейшаму ці то макрэча, ці то лёгкая ранішняя шэрань. Усё навокал дыхае адным пытаннем: калі ж, калі вясна ўзарве паднябессе песняй жаўрука, а зямля ажыве спевам раўчукоў і гулам крыгаходу па рэках?

А вясна не спяшаецца. Чакалі, чакалі нашы продкі вясны, ды пачыналі клікаць яе песняй-загуканнем.

Гуканне вясны пачыналася 14 сакавіка. Звычайна ў поўдзень моладзь збіралася гуртамі і ішла за ваколіцу, на ўзвышша, спяваць. Высокае месца выбіралася таму, што яно першае вызвалялася з-пад снегу, падсыхала, адсюль усё было далёка відаць, а песні-гуканні разносіліся аж да суседніх вёсак:

Ой, выйдзем на горку,<br>
Ды паклічам Бога<br>
Адамкнуць зямліцу,<br>
Выпусціць расіцу.

Хлопцы ў гэты час збіралі з усяе вёскі розную старызну: лапці, паламаныя калёсы, гнілыя бароны, патрэсканыя кашы, дзеркачы – зносілі іх у адно месца і распалівалі вогнішча.

Моладзь – аснова жыцця, паліла надакучыўшую зіму, ачышчала зямлю ад усяго непатрэбнага ў заўтрашнім земляробчым клопаце.

Вясна бачылася нашым продкам часам новага ўваскрэсення, святам пачатку новага года, лета. Вось таму і ачышчалі хлопцы зямлю, а дзяўчаты поўнілі яе песнямі-гуканнямі, асноўны матыў якіх зводзіўся да праціпастаўлення састарэлай зімы доўгачаканаму лету:

Зіма з летам сустракаецца,<br>
Пра здаровейка пытаецца:

- Ой, чалом, чалом, ды цёплае лецейка!
- Ой, здарова была, ды халодная зімачка!
- Што цябе, лецейка, узвелічаюць,
Мяне, зімачку, праклінаюць?
- Бо ты, зімачка, халодная,
Лугі, балоты памарозіла.
Ой, я, лецечка, ды вясолае,
Лугі, горы ізмачыла,
Лугі, горы ўзвесяліла.

Рытуал замыкання зімы і адмыкання вясны можна было пачынаць толькі з дазволу старэйшых і найбольш паважаных людзей вёскі або сям'і, таму і гучаць у песнях звароты да іх:

Благаславіце, старыя людзі,
А й вясну-красну сусракаць,
Загукаць жа.
Лютую зіму ж замыкаць,
Замыкаці.

Кожны радок песні заканчваецца працяглым гуканнем "у-у-у!". Заспяваная на пагорку песня далёка неслася ў чыстым паветры.

Як у калядных, так і ў вясновых песнях гучаць пажаданні паляпшэння дабрабыту, сабраць багаты ўраджай, своечасова справіцца з усімі веснавымі і леташнімі работамі:

Благаславі, Божа,
Вясну-красну пеці
На ціхае лета,
На буйное жыта.
Каб наша жыта
У трубы павілася,
На бок схілілася!

Чалавек радаваўся абуджэнню прыроды, якое несла надзею на лепшае жыццё, але дасягнуць паляпшэння можна было толькі сумленнай, крапатлівай працай. І ўсё ж разам з вясной адраджалася надзея, спадзяванне.

14 сакавіка беларусы адзначалі дзень Аўдакеі, ці Аўдоцці-вясноўкі, якая лічылася раней галоўнай летняй гаспадыняй. Ў народзе існавала прыкмета: калі ў гэты дзень певень нап'ецца вады з-пад страхі, то вясна будзе ранняя, цёплая.

Вялікім святам лічыцца дзень 22 сакавіка, калі адзначаюць "Саракі". Меркавалася, што вясна паволі ўступае ў свае правы і з далёкіх паўднёвых краін дадому вяртаюцца 40 выраяў. Жанчыны выпякалі з цеста для дзяцей

сорак піражкоў у выглядзе птушак. Дзеці бегалі па вёсцы, высока трымаючы “птушку” ў руцэ і спявалі веснавыя песні. Вечарам рытуальнае печыва трэба было з’сці.

У некаторых раёнах выпякалі печыва ў форме лапы бусла. Фігуркі гэтыя называліся “галёны”. Хлопчыкі выбягалі з імі на вуліцу і, узняўшы іх высока, голасна заклікалі:

Бусел, бусел, на табе галёну,
Дай мне жыта капу!

Зварот менавіта да бусла невыпадковы. Для Беларусі бусел з’яўляецца вешчай птушкай, якая вяртаецца з выраю і прыносіць новае лета, новую надзею на паляпшэнне дабрабыту. Бытуе павер’е аб тым, што пашчасціць таму дварышчу, паблізу якога бусел паложыць гняздо.

Магічная лічба, якая ўвайшла ў назву свята “Саракі”, звязана са шматлікімі павер’ямі, прыкметамі і абрадавымі дзеяннямі.

Лічылася, што сарока ў гэты дзень пачынае віць сабе гняздо і прыносіць сорак галінак, каб птушкам лягчэй было рабіць гнёзды. Дзяўчаты прыносілі ў хату і калолі каля печы як мага болей дроў. Калі ж на свята было марозна, то казалі, што вясну наперадзе чакае яшчэ 40 замаразкаў.

Маладыя людзі выконвалі і іншыя рытуальныя дзеянні. Напрыклад, дзяўчаты ў касу ўплятапі кавалачак адрэзанага хваста каровы, каб каса была тоўстая і доўгая. Дзеці кідалі аб сцяну ў хлеве па жмені саломы. Меркавалася: колькі саломы павісне на сцяне, гэтулькі яек штодзень будуць прыносіць куры.

Свята Саракі, ак і Аўдакеі-вясноўкі, былі чарговым этапам свята гукання вясны, якое доўжылася аж да самага Благавешчання.

Дадатак 3

## Беларускі дзіцячы фальклор

### *Заклічкі*

***

Прыдзі, прыдзі, вясна,
Прыдзі, прыдзі, красна
Да нас у садочак.
Прынясі нам збожжа,
Прынясі нам красак,
Каб звіць нам вяночак.

***

Вылеці, пчолка яркая,
Вынесі залатыя ключыкі,
Замкні халодную зіманьку,
Адамкні цёплае лецейка.

***

Прыляцела ластавіца,
Прынесла нам масленіцу,
Села на жэрдачку,
Шчабятала вестачку,
Палятала, пакружыла,
Нам вясну апавясціла.

***

Вясна, вясна-красна!
Прыйдзі, вясна-красна!
Прыйдзі, вясна, хутчэй!
Сонейкам  усіх абагрэй

***

Вясна, вясна красная,
Прыдзі, вясна, з радасцю,
З дажджамі моцнымі,
З хлябамі багатымі.

***

Гэй, вясна, гэй, красна,
Што ты нам прынясла?
Ці па яечку, ці па пірожэчку,
Ці сыра кусок, ці сала брусок?
Гэй, вясна, гэй, красна!

***

Згары, зіма, ты нядобрай была!
Адыдзі, зіма, ты  лютай была!
Згінь, зімачка, ты  халоднай была!
Пусці вясну на зянельку нашу!

***

Зіме канец, вясне пачатак!
Хай будзе весела ў гэтае свята!
Гэй, музыка, грай, жару паддай!
Зробім круг вялікі,
Хай скачуць чаравікі!

***

Паклон добрай вясне,
Яна шчасце нясе!
Благаславі, Божа, вясну-красну пеці:
На ціхае лета, на буйное жыта.
Каб наша жыта ў трубы павілося,
Набок схілілася.

Дадатак 4

## Беларускія рухомыя гульні

### *Промень сонейка*

Дзеці становяцца ў груг. У яго цэнтры дзіця з маскай-шапачкай сонейка на галаве. Дзеці ідуць па кругу і кажуць словы:

Промень сонейка гуляе
Па сцяжынкам, па садам,
Усіх цяплом сваім ласкае,
Заглянуўшы ў госці к нам.
Праменьчык, праменьчык,
Я хачу з табой гуляць.
Калі ты мяне дагоніш,
Буду зайчыкам скакаць!

Да каго вядучы дакранецца, з тым яны бягуць уздагонкі па-за кругам. Калі вядучы даганяе дзіця, той становіцца ў круг і скача, як зайчык, а потым становіцца вядучым.

### *Шпакі*

Дзеці ідуць па крузе, кажуць словы і выконваюць дзеянні:

Ой, тукі, тукі, тукі, - *стукаюць кулачок аб кулачок;*
Прыляцелі к нам шпакі, - *машуць рукамі, як крыламі;*
А як гуслі загучаць, - *выхавацель праводзіць па струнах гусляў;*
Усе ў шпакоўні паляцяць. - *дзеці становяцца парамі спінамі адзін да аднаго, прамыя рукі ў бакі.*

Дадатак 5

## Сцэнарый фальклорнага свята
## “Гуканне Вясны”

**Вядучы:** Надакучыла нам зіма, надакучылі марозы ды завірухі. Дзеці, у беларускага народа існаваў вельмі прыгожы веснавы абрад – заклікание вясны. Ці трэба вам вясна-красна!

**Дзеці:** Трэба.

**Вядучы:** І вось мы з вамі сёння будзем заклікаць Вясну-красну.

**Вядучы:** У даўнія часы людзі ўслаўлялі птушак – вестуноў вясны. Лічылі, што ў гэтыя дні птушкі вяртаюцца з выраю, з далёкіх краёў. А назавіце мне, дзеці, калі ласка пералётных птушак (дзеці пералічваюць вядомых пералётных птушак).

Давайце зараз пагуляем у гульню “Птушкі ляцяць”

А каб птушкі хутчэй прыляцелі да нас і радавалі нас сваім шчабятаннем і спевамі, цёплае лецечка прынеслі, зімачку прыбралі, мы заспяваем песню “Родны бусел”.

**Вядучы:** А зараз самы час нам з вамі паклікаць Вясну-красну.

**Дзеці:** Прыходзь, Вясна!

**Уваходзіць Зіма.**

**Зіма:** Гэта хто тут гаспадарыць збіраецца? Я гаспадыня, як захачу так і будзе.

**Вядучы:** Ды позна, зімачка, кружыцца, надышла пара ўцякаць табе са двара. Унасі хутчэй ногі, ачысці вясне дарогу.

**Зіма:** Як бы не так. Паглядзі, чаго хочуць! Ня будзе па-вашаму.

**Вядучы:** Што ж рабіць будзем? Дзеці, а калі мы адалеем зімушку, глядзіш,і вясна з’явіцца. Выклікаем цябе, Зіма, на бойку.

**Зіма:** Усе на адну? На санках, лыжах каталісь? Каля ёлкі скакалі? А зараз мяне, зімушку, пажалець няма каму.

**Вядучы:** Не хвалюйся, мы ж сумленна з табой спаборнічаць будзем, Зімушка.

**Зіма:** Добра, я згодна. Пачнём з загадак. (Зіма загадвае загадкі аб зіме).

**Вядучы:** Зараз, Зіма, адгадай нашы загадкі.

**Зіма:** Давайце ў гульнях спаборнічаць.

Гульня “Хто хутчэй”

Ладна, згодна, вы мацнейшые, пераадолелі мяне, калі так, трэба мне збірацца ў дарогу. Да пабачэння, сустрэнемся ў новым годзе!

**Вядучы:** А зараз яшчэ раз паклічам вясну, а каб яна нас пачула, мы заспяваем песню “Прыходзь вясна”.

**Уваходзіць Вясна.**

**Вясна:** Добры дзень, людзі добрыя.

**Дзеці:** Мы цябе гукаем, мы цябе чакаем.

**Вядучы:** А што ты нам прынесла, Вясна?

**Вясна:** А прынесла я вам цёпла лета ціхае и цёплую вадзіцу.

**Вядучы:** А што гэта ў цябе?

**Вясна:** Веткі дрэва сімвалізуюць абуджэнне прыроды, званочкі – веснавую навальніцу, мяцёлка – маланку, пуга – карміцеля – чысты дождджык.

**Вядучы:** Давайце заспяваем нашай госце прыгожую песню!

**Песня аб вясне.**

**Хлопчык:** Вясна-красна, а што ты нам яшчэ прынесла?

**Вясна:** Пастушкам па кіёчку, а дзяўчынкам па вяночку.

І зараз пагуляем у гульню “Дзяўчынка-вяснянка”.

А яшчэ я вельмі люблю вясёлых музыкантаў, якія ўмеюць іграць на музычных інструментах.

Іграна музычных інструментах (аркестр).

**Вясна:** Вельмі цікавая і прыгожая музыка, малайцы, дзеткі!

**Вядучы:** Нашы дзеці хочуць заспяваць, яны вельмі любяць беларускія песні.Зараз яны заспяваюць табе, Вясна. Ў гэтай песні дзеці будуць славіць сонейка вясны. Паслухай, калі ласка.

**Песня “Веснавое сонейка”.**

**Вясна:** Дзякуй, я вас хачу пачаставаць. Шчасце хай будзе вам гарою, гаспадыням ураджая вялікага. На стале заўсёды пірагоў смачных. Дзеткам – багата здароўя і розуму!

**Вядучы:** Дзякуй, Вясна, за пажаданні.

**Вясна:** Да пабачэння, усяго вам добрага!

**Вядучы:** Пайшла Вясна далей па зямлі. Але не сумуйце, давайце на прыканцы нашага свята ўсе зараз паскачым вясёлую польку.

**Полька “Беларуская”.**